# КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КАРЦІННАЙ ГАЛЕРЭІ Г. Х. ВАШЧАНКІ

**Л. В. Голуб**, *магістрант*
*кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

Наведванне музея для большасці людзей звычайна асацыюецца ці з удзелам ў арганізаванай экскурсіі, ці з «індывідуальным» аглядам экспазіцыі. Экскурсія з'яўляецца галоўнай, але не адзінай формай культурна-адкацыйнай дзейнасці музея. Уяўленне аб колькасці форм культурна-адукацыйнай работы ў музеязнаўчай літаратуры вар'іруецца ад дзясятка да сотні і болей. Да базавых форм культурна-адукацыйнай работы адносяць, акрамя экскурсіі, лекцыю, кансультацыю, навуковыя чытанні (канферэнцыя, сесія, пасяджэнне і інш.); клуб (студыя, кружок і інш.); конкурс (віктарына, алімпіяда і інш.); вечар сустрэч, канцэрт (кінасеанс, тэатралізаванае прадстаўленне, літаратурны, літаратурна-музычны вечар і г.д.); музейнае свята, сямейныя абанементы выхаднога дня, музейную гульню, майстар-клас.

Стварэнне ў лютым 2002 г. у Гомелі Карціннай галерэі Г. Х. Вашчанкі паўплывала на фарміраванне культуры ўсяго рэгіёна. Галерэя прадстаўлена калекцыяй сучаснага беларускага мастацтва і знаёміць наведвальнікаў з рознымі плынямі ў выяўленчым мастацтве.

У аснову былі пакладзены творы калекцыі Гаўрылы Харытонавіча Вашчанкі, якія сталі зыходнай кропкай для новай хвалі выстаў выяўленчага мастацтва. Мастакі Гомельскай вобласці атрымалі дадатковую магчымасць выстаўляць свае работы побач з палотнамі майстроў айчыннага і сусветнага ўзроўню.

Асноўнай дзейнасцю Карціннай галерэі Г. Х. Вашчанкі з'яўляецца правядзенне выстаў выяўленчага мастацтва. Яна трывала зарэкамендавала сябе як сучасны цэнтр культурнага жыцця горада, дзе праходзяць выставы самага высокага мастацкага ўзроўню. За час сваёй дзейнасці галерэя прыняла каля 110 выстаў. Штогод праводзіцца каля 30 выставачных праектаў як ва ўласных залах, так і за межамі галерэі, у тым ліку і за мяжой. Выставы, якія праводзіліся ў галерэі, ахопліваюць практычна ўсе жанры сучаснага мастацтва – ад класічнага рэалізму да абстрактных канцэптуальных праектаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасць Карціннай галерэі Г. Х. Вашчанкі выходзіць за рамкі дэманстрацыі твораў выяўленчага мастацтва. Надаецца вялікая ўвага рабоце ў галіне патрыятычнага выхавання моладзі; супрацоўніцтву з рознымі прадпрыемствамі і ўстановамі горада па арганізацыі іх ідэалагічнай працы на базе галерэі; супрацоўніцтву з цэнтрамі сацыяльнай абароны, ветэранамі (святы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне і Дню пажылога чалавека).

У галерэі праводзяцца не толькі экскурсіі па калекцыях, але і сустрэчы, семінары, лекцыі. Конкурсы, сустрэчы, вечарыны – культурна-адукацыйныя формы, да якіх часцей за ўсё звяртаюцца супрацоўнікі ў сваёй дзейнасці. Менавіта такія мерапрыемствы атрымалі станоўчы водгук наведвальнікаў. У якасці падобных мерапрыемстваў можна адзначыць удзел галерэі ў арганізацыі і правядзенні выязнога пасяджэння Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта па пытанні «Аб ходзе выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 лютага 2008 г. № 110 «Аб падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 65-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне»; правядзенне абласнога семінара па інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогіях як сродку падачы інфармацыі пры арганізацыі музейнай дзейнасці – для намеснікаў дырэктараў па выхаваўчай рабоце. Супрацоўнікі галерэі прымалі ўдзел у «Велікодным семінары» Гомельскай абласной епархіі, у семінары «Ад правінцыяльнай галерэі да буйнога выставачнага цэнтра», які праводзіўся ў Інстытуце імя Гётэ ў Мінску. Актыўна ўдзельнічалі ў семінары «Музей у кантэксце гістарычнага асяроддзя». На базе галерэі прайшоў семінар «Міжнародныя выставачныя праекты і іх сувязь з культурным выхаваннем моладзі» для намеснікаў дырэктараў па выхаваўчай рабоце сярэдніх школ Гомеля.

Вялікі рэзананс выклікала сацыяльная праграма карціннай галерэі «Дарога ў свет мастацтва» для асуджаных. У 2009 г. у рамках гэтага праекта быў арганізаваны конкурс выяўленчага мастацтва сярод асуджаных непаўналетніх папраўчай калоніі № 4 г. Гомеля. Яны малявалі работы на тэмы: «Запаветная мара», «Першы дзень на волі» і «Самы шчаслівы дзень». Акрамя таго, канкурсантам прапаноўвалася расказаць пра свае думкі, пачуцці, эмоцыі, якія суправаджалі іх у момант творчасці. Конкурс ставіў задачу падтрымаць творчыя здольнасці, дапамагчы фарміраванню светапогляду падлеткаў, якія былі адарваны часова ад соцыуму. За

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэты час перасовачныя выставы з фондаў галерэі пабывалі ва ўсіх папраўчых установах вобласці адкрытага і закрытага тыпу, з асуджанымі сустракаліся мастацтвазнаўцы і мастакі. У якасці заахвочвання за добрыя паводзіны каланісты неаднаразова наведвалі галерэю.

Конкурс – адна з культурна-адукацыйных форм, якая з'яўляецца сродкам выяўлення актыўнасці аўдыторыі. Да яе нярэдка звяртаюцца ў сваёй дзейнасці супрацоўнікі галерэі. У якасці прыкладу можна прывесці штогадовы абласны конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці, прысвечаны памяці С. Д. Дзьяканава. Галоўныя мэты мерапрыемства – фарміраванне духоўнай культуры грамадства, выяўленне і падтрымка юных талентаў; развіццё творчых здольнасцей моладзі сродкамі выяўленчага мастацтва; знаёмства з творчасцю сучасных беларускіх мастакоў і творчай спадчынай С. Д. Дзьяканава. У 2011 г. на конкурс было прадстаўлена каля 300 дзіцячых прац. Журы конкурсу складалася з прафесійных мастакоў, мастацтвазнаўцаў і выкладчыкаў, якія на працягу гадоў працуюць з дзецьмі ў галіне выяўленчага мастацтва. Лепшыя конкурсныя работы выстаўляліся ў галерэі.

Яшчэ адзін прыклад культурна-адукацыйнай формы, накіраванай на работу з дзіцячай і юнацкай аудыторыяй, –абласны конкурс пад назвай «Спорт… Спорт? Спорт!», які прысвечаны 10-годдзю Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь у намінацыях: «Малюнак», «Сачыненне», «Верш». На выставе былі прадстаўлены працы ўдзельнікаў конкурсу ад 5 да 22 гадоў, выкананыя ў розных жанрах і тэхніках выяўленчага мастацтва і прысвечаныя спартыўнаму руху. Дадзенае мерапрыемства ставіла мэтамі не толькі папулярызацыю алімпійскага руху і прапаганду здаровага ладу жыцця, але і развіццё творчых здольнасцей моладзі, падтрымку юных талентаў і фарміраванне духоўнай культуры грамадства.

Адной з форм культурна-адукацыйнай дзейнасці з'яўляюцца сустрэчы, вечарыны. Сустрэчы з мастакамі сталі добрай традыцыяй пры правядзенні персанальных мастацкіх выстаў. Гэтыя мерапрыемствы дапамагаюць навучэнцам лепш зразумець выяўленчае мастацтва, даведацца аб разнастайных тэхніках мастакоў.

У 2005 г. у карціннай галерэі адбылася сустрэча дзяцей з малазабяспечаных сем'яў з заслужаным дзеячам мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэспубліকі Беларусь, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь М. К. Казакевічам. У праграме мерапрыемства былі літаратурная кампазіцыя «Радзіма» (вершы рускіх і беларускіх паэтаў), знаёмства з творчасцю мастака, культурная праграма.

У пачатку 2009 г. арганізаваны новы сацыяльна-пазнавальны праект «Размова па душах», у рамках якога ў галерэі адбылася сустрэча творчых жанчын Гомеля «Увойдзем у вясну разам». Гучала музыка, быў праведзены паказ мод. Супрацоўнікі галерэі ставяцца да людзей з адмысловай цеплынёй.

Шмат увагі ў дзейнасці галерэі надаецца арганізацыі вечарын. Першае падобнае мерапрыемства было праведзена ў 2003 г. – вечар беларуска-кітайскага сяброўства «Дыялог культур». У праграме былі нумары мастацкай самадзейнасці беларускіх і кітайскіх студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, праведзены экскурсіі па экспазіцыі галерэі, дзе ў ролі экскурсаводаў выступалі навучэнцы дарожна-будаўнічага тэхнікума. Выразнае чытанне вершаў, спевы на кітайскай і рускай мовах, танцы прадставілі кітайскія студэнты. Эстафету падхапілі на беларускай мове студэнты філалагічнага факультэта ГДУ. Дадзенае мерапрыемства спрыяла развіццю камунікатыўных і творчых здольнасцей моладзі.

У верасні 2011г. у рамках мерапрыемстваў праграммы «Гомель – культурная сталіца Беларусі» адбылося адкрыццё сацыяльна-творчага праекта «Маляванки – Нахатеби» ў рамках Дзён культуры Грузіі. У гэтым праекце прынялі ўдзел 5 мастачак з Грузіі і Беларусі: Экатарінэ Асепашвілі, Тамар Сазіашвілі, Ганна Балаш, Таццяна Сінкевіч і Вольга Аржанухіна. Мэтай гэтага праекта было пашырэнне культурных сувязей Беларусі і Грузіі. Праект пачаўся адкрыццём сумеснай выставы. Затым прайшоў майстар-клас для дзяцей цэнтра медыцынскай рэабілітацыі «Жывіца». На працягу тыдня мастакі сумесна працавалі над сімвалічным палатном сяброўства, якое напрыканцы праекта было перададзена ў Гомельскі дзіцячы цэнтр медыцынскі рэабілітацыі.

Галерэя бярэ актыўны удзел у барацьбе з актуальнымі сёння праблемамі. Яскравы таму прыклад – выстава-акцыя прац студэнтаў Гомельскага гарадскога мастацкага вучылішча «Каштоўнасць жыцця – у кожным імгненні», праведзеная сумесна з Гомельскім гарадскім камітэтам грамадскага аб'яднання «БРСМ» у рамках Сусветнай кампаніі супраць СНІДу. Пытанні псіхалагічнага выхавання падрастаючага пакалення, адаптацыі падлеткаў да рэалій сучаснага жыцця заўсёды з'яўляюцца аднымі з самых актуальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблем нашага часу. Асноўная ідэя акцыі, лозунгамі да якой былі «Шануйце жыццё!», «Беражыце жыццё!», «Кахайце жыццё!», «Дзякуйце за жыццё!», – каштоўнасць жыцця кожнага чалавека на зямлі.

У сувязі з правядзеннем у Рэспубліцы Беларусь Дня інвалідаў, у 2008 г. у галерэі Г. Х. Вашчанкі адбылася дабрачынная акцыя для дзяцей абласнога цэнтра рэабілітацыі.

Такім чынам, культурна-адукацыйная дзейнасць – адзін з важнейшых напрамкаў, на якім рэалізуюцца асноўныя сацыяльныя функцыі галерэі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ